УДК 93/94(930)

# Выкарыстанне вусных гістарычных крыніц у выкладанні курса "Гісторыя Беларусі"

Кедрык Т. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсытэт

Вусныя гістарычныя крыніцы маюць доўгую гісторыю існавання і выкарыстання ў гістарычнай навуцы, хоць і з'яўляліся часцей толькі дапаўненнем і ілюстацыяй для традыцыйных пісьмовых гістарычных крыніц. У працэсе фарміравання вуснай гісторыі, як самастойнага накірунку гістарычнай навукі, змянілася стаўленне і да саміх крыніц вуснага паходжання. Менавіта вусныя крыніцы дазваляюць зафіксаваць унікальную інфармацыю, якая не перадаецца іншым шляхам. Перавагі вуснай гісторыі складаюцца, перш за ўсё, у тым, што яна перадае "дух часу", які вельмі цяжка ўлавіць з афіцыйных дакументаў, гэта жывая гісторыя, якая спрыяе пераадоленню абязлічвання як канкрэтнай тэмы, так і гістарычнага працэса. Тым самым гісторыі вяртаецца чалавечае вымярэнне.

Выкарыстанне вуснагістарычных крыніц у адукацыйным працэсе дае новыя магчымасці разумення сэнсаў гістарычых падзей і працэсаў, дае магчымасць звярнуцца да суб'ектыўнага пачатку ў гісторыі, масавай і індывідуальнай гістарычнай свядомасці людзей XX ст., механізмаў гістарычнай памяці. Праца з вуснымі гістарычнымі крыніцамі вучыць студэнтаў самастойна разбірацца ў мінулым, даваць ацэнкі падзеям і з'явам найноўшай гісторыі, мінімізаваць палітычны і ідэалагічны ціск СМІ, ангажаваных публіцыстаў, палітыкаў і гісторыкаў.

Дапаўненне традыцыйных пісьмовых крыніц і архіўных дакументаў вуснагістарычнымі матэрыяламі ў даследчай рабоце студэнтаў стварае комплексную базу, на аснове якой могуць быць рэалізаваны прынцыпы фарміравання навукова-разумовай дзейнасці:

1) аналіз і параўнанне некалькіх крыніц інфармацыі, якія змяшчаюць супрацьлеглыя пункты гледжання або супярэчлівыя звесткі; 2) ацэнка ступені суб'ектыўнасці і дакладнасці крыніцы, уменне здабываць з яго новую інфармацыю;3) самастойнае апісанне і тлумачэнне грамадскіх з'яў, якія раней не вывучаліся;4) фарміраванне ўласнага пункту гледжання.

Відавочна, што менавіта гісторыя другой паловы XX ст. можа вывучацца праз выкарыстанне вусных гістарычных крыніц і перш за ўсё тых тэм, якія доўгі час замоўчваліся і не даследаваліся ў савецкай гістарыяграфіі – тэма рэпрэсій і раскулачвання, калектывізацыі, пасляваеннага голада, дэсідэнцкага руху.